Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Жыццё
# са знакам якасці

***Інфармацыйна-аналітычны зборнік даследчых краязнаўчых праектаў у рамках конкурсу «Імя ў летапісе малой радзімы»***

Кобрын
2024

УДК 027(476.7)(092)
ББК 78.342(4Беи)я2
Ж94

***Складальнік***
бібліёграф І катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы
С. Д. Курачук

Ж94 **Жыццё са знакам якасці** : інфармацыйна-аналітычны зборнік даследчых краязнаўчых праектаў у рамках конкурсу «Імя ў летапісе малой радзімы» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2024. – 30 с. : фат.

Мэтай зборніка з'яўляецца выяўленне найбольш цікавых і значных краязнаўчых даследаванняў, абагульненне і распаўсюджванне паспяховага вопыту ў сферы гісторыка-краязнаўчай даследчай дзейнасці, у стварэнні банка даных вядомых людзей Кобрыншчыны

Выданне адрасуецца бібліятэчным работнікам, краязнаўцам і ўсім, хто цікавіцца гісторыяй сваёй малой радзімы, імёнамі выдатных землякоў краю

**УДК 027(476.7)(092)**
**ББК 78.342(4Беи)я2**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2024

# ПРАДМОВА

У 2023 годзе сярод супрацоўнікаў сельскіх бібліятэк Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы праводзіўся раённы конкурс даследчых краязнаўчых работ «**Імя ў летапісе малой радзімы**».

Асноўня мэта конкурсу - уславўленне малой радзімы праз папулярызацыю імёнаў славутых землякоў, а таксама стымуляванне творчай актыўнасці і прафесійных навыкаў супрацоўнікаў бібліятэк у краязнаўча-пошукавай дзейнасці, у стварэнні банка даных вядомых людзей Кобрыншчыны.

Па выніках раённага конкурсу была аформлена выстава-гонар пад назвай «**Жыццё са знакам якасці**» і пачаліся краязнаўчыя чытанні пад аднайменнай назвай.

Краязнаўчыя чытанні з’явіліся заключным этапам конкурсу «Імя ў летапісе малой радзімы», і іх вынікі выклікалі пачуццё гонару сваёй малой радзімай, якая стала калыскай для многіх таленавітых і выдатных людзей, што праславілі яе рознымі прафесійнымі дасягненнямі.

Кожны з удзельнікаў сваё даследаванне падмацаваў выставай дакументаў, фотаздымкаў, відэа-прэзентацыяй, выданнямі, падрыхтаванымі асабіста. Удзельнікам чытанняў удалося не проста ўспомніць аб жыцці і дзейнасці вядомых землякоў, паказаць фота- і відэадакументы, але і атрымаць новую інфармацыю.

Раённыя краязнаўчыя чытанні «Жыццё са знакам якасці» падыйшлі да заканчэння, але работа па стварэнні банка даных вядомых людзей Кобрыншчыны не завершана. Яна будзе працягваецца.

Радзіма пачынаецца з памяці, і крыніц звяртання да яе існуе шмат. Трэба іх выкарыстоўваць, пазнаваць сваю малую радзіму, адкрываць новыя старонкі гісторыі, імёны знакамітых землякоў, захоўваць памяць пра іх добрыя справы на карысць роднай Беларусі і Кобрыншчыны.


Раённы конкурс
даследчых
краязнаўчых работ
«ІМЯ Ў ЛЕТАПІСЕ
МАЛОЙ РАДЗІМЫ»

# ПАЛАЖЭННЕ
# аб раённым конкурсе
# «ІМЯ Ў ЛЕТАПІСЕ МАЛОЙ РАДЗІМЫ»

## I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага конкурсу даследчых краязнаўчых работ «Імя ў летапісе малой радзімы» (далей – Конкурс) сярод бібліятэчных работнікаў дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (далей - Установа).

1. 2. Конкурс прымеркаваны да Года міру і стварэння.

1.3. Арганізатарам конкурсу з'яўляецца Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка (далей – ЦРБ).

## II. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ

2.1. Садзейнічанне актывізацыі краязнаўчай дзейнасці публічных бібліятэк.

2.2. Фарміраванне матывацыі, далучэнне супрацоўнікаў бібліятэк да пошукавай, даследчай работы.

2.3. Стымуляванне творчай актыўнасці і прафесійных навыкаў супрацоўнікаў бібліятэк у краязнаўча-пошукавай дзейнасці.

2.4. Вывучэнне жыццёвага і працоўнага шляху вядомых людзей сваёй малой радзімы.

2.5. Услаўленне малой радзімы праз папулярызацыю імёнаў славутых землякоў.

2.6. Стварэнне ўласнага электроннага краязнаўчага прадукта.

2.7. Выяўленне найбольш цікавых і значных краязнаўчых даследаванняў, абагульненне і распаўсюджванне найбольш паспяховага вопыту ў сферы гісторыка-краязнаўчай даследчай дзейнасці.

## III. ПАРАДАК І УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3.1. Конкурс праводзіцца ў наступныя тэрміны:
пачатак конкурсу - 1 сакавіка 2023 года,
заканчэнне прыёму работ – 1 лістапада 2023 года,
публічная абарона, прэзентацыя даследчых работ - 17 лістапада 2023 года,
падвядзенне вынікаў – снежань 2023 года.

3.2. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу будзе прадстаўлена на інфармацыйным сайце Установы.

3.3. У Конкурсе прымаюць удзел усе публічныя бібліятэкі Установы.

3.4. Даследчыя работы прадастаўляюцца на папяровым носьбіце і ў электронным выглядзе.

3.5. Дапаўненнем да тэкставай работы з'яўляюцца мультымедыйныя дадаткі, якія падаюцца ў электронным выглядзе.

3.6. Метадычную падтрымку конкурсу ажыццяўляюць бібліёграфы аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦРБ.

## IV. ПАТРАБАВАННІ ДА ЗМЕСТУ РАБОТ

4.1. Даследчая праца аб жыцці і дзейнасці вядомых землякоў павінна ўяўляць сабою даследаванне, заснаванае на дэталёвым зборы дадзеных (важныя вехі жыццядзейнасці, дасягненні, справы на карысць вялікай і малой радзімы і г. д.). Асноўныя крыніцы даследавання — гэта інтэрв'ю, аўтабіяграфія героя, расповеды родных, успаміны знаёмых, блізкіх; архіўныя крыніцы, сямейныя фотаздымкі, працоўныя ўзнагароды; публікацыі (друкаваныя, электронныя), іншыя запісы.

4.2. На Конкурс прадстаўляюцца індывідуальныя работы, у якіх распавядаецца пра адметных землякоў, якія ў розныя гістарычныя перыяды дасягнулі поспехаў у разнастайных сферах дзейнасці, якія нарадзіліся, жылі на кобрынскай зямлі ці вылучыліся сваімі здольнасцямі ў іншых рэгіёнах, краінах, а таксама славутых земляках-сучасніках.

4.3. На Конкурс не прымаюцца працы, якія не маюць дачынення да тэматыкі конкурсу, носяць недаследчы характар.

4.4. На Конкурс прымаюцца работы на папяровым носьбіце ў адпаведнасці з наступнымі патрабаваннямі:

*тытульны ліст*, на якім павінна быць назва Конкурсу, тэма работы, назва ўстановы культуры, прозвішча канкурсанта, нумар кантактнага тэлефона;

*аб'ём* конкурснай работы не абмежаваны Тэкст работы павінен быць надрукаваны ў тэкставым рэдактары MS Word. Шрыфт Times New Roman, фармат А 4, кегель 14, інтэрвал 1,5; палі: справа – 15 мм, злева – 30 мм, зверху і знізу – па 20 мм). Нумарацыя старонак – знізу па цэнтры старонкі. Пажадана фотадакументальнае суправаджэнне;

*спіс крыніц* павінен адпавядаць агульнапрынятым бібліяграфічным правілам.

## V. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ КОНКУРСНЫХ ПРАЦ

5.1. Адпаведнасць тэматыцы, парадку і ўмовам правядзення Конкурсу.

5.2. Глыбіня праведзенага даследавання, паўната раскрыцця тэмы.

5.3. Арыгінальнасць (уласны падыход да выбару тэмы і яе раскрыцця).

5.4. Змястоўнасць і мастацкі падыход (работа ў выглядзе інфармацыйна-публіцыстычнага жанра: інтэрв'ю, нарыса, эсэ, нататка).

5.5. Выкарыстоўванне ў рабоце матэрыялаў з самых разнастайных крыніц, ступень іх апрацоўкі (публікацыі, сямейны архіў, архіўныя матэрыялы, вусныя крыніцы, надмагільныя надпісы).

5.6. Нагляднасць ілюстрацыйнага матэрыялу (генеалагічны роспіс, малюнкі, фотаздымкі).

5.6. Краязнаўчая і грамадска-практычная значнасць работ.

## VI. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ

6.1. Для правядзення Конкурсу, ацэнкі работ удзельнікаў і падвядзення вынікаў Конкурсу ствараецца Аргкамітэт (гл. Дадатак).

6.2. Па выніках конкурсу пераможцам уручаюцца дыпломы I, II, III ступені. Па рашэнню журы лепшыя работы могуць быць адзначаны спецыяльнымі дыпломамі.

6.4. Вынікі конкурсу будуць размешчаны на сайце Установы.

«Якасць - гэта не толькі пра эканоміку і вытворчасць,
але перш за ўсё пра чалавека»

*А. Лукашэнка,*
*Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь*

# Раённыя краязнаўчыя чытанні
# «ЖЫЦЦЁ СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ»
## ў рамках раённага конкурсу
## «ІМЯ Ў ЛЕТАПІСЕ МАЛОЙ РАДЗІМЫ»

# СЛАЎНЫ ПРАЦАЙ ЧАЛАВЕК

БЕЛАРУСЬ

2024 - год якасці

## ГЕРОІ КРАЯЗНАЎЧЫХ ЧЫТАННЯЎ

БОГДАН АЛЕНА ЛЕАНІДАЎНА

ВЕРХАВЕЦ УЛАДЗІМІР ЛУКІЧ

ГІЛЁВА НАДЗЕЯ ДЗМІТРЫЕЎНА

ГЛАВАЦКАЯ НІНА НІКІЦІЧНА

ГРЫНЕВІЧ МІКАЛАЙ КІРЫЛАВІЧ

ЗАПАШНІК ЯЎГЕНІЙ КАЗІМІРАВІЧ

КІРЫЕЎСКІ ПАВЕЛ ІВАНАВІЧ

КІРЫЛЮК МАРЫЯ АНДРЭЕЎНА

ЛЕВАНЮК ЯЎГЕНІЙ ЯЎГЕНЬЕВІЧ

ПАРХУЦІК ІВАН ЯКАЎЛЕВІЧ

РАМАНЮК АЛЕНА ФАМІНІЧНА

ФІЛЮТОВІЧ ВЕРА ЛЬВОЎНА

ШВАЙКО ВАЛЯНЦІНА ФЁДАРАЎНА

ШУГАЙ ДЗМІТРЫЙ РЫГОРАВІЧ


Верхавец
Уладзімір Лукіч


Кірылюк
Марыя Андрэеўна


Грыневіч
Мікалай Кірылавіч


Гілёва
Надзея Дзмітрыеўна


Богдан
Алена Леанідаўна


Шугай
Дзмітрый Рыгоравіч


Раманюк
Алена Фамінічна


Філютовіч
Вера Львоўна


**Швайко**
**Валянціна Фёдараўна**


**Леванюк**
**Яўгеній Яўгеньевіч**


**Пархуцік**
**Іван Якаўлевіч**

**Главацкая**
**Ніна Нікіцічна**





**Кірыеўскі**
**Павел Іванавіч**







***Выстава-гонар конкурсных даследчых краязнаўчых работ «Імя ў летапісе малой радзімы***

# I этап

**Агульная інфармацыя аб правядзенні раённага конкурсу «ІМЯ Ў ЛЕТАПІСЕ МАЛОЙ РАДЗІМЫ»**

*бібліёграф I катэгорыі*
*аддзела абслугоўвання і інфармацыі*
*С. Д. Курачук*

**ПРАЦАВАЎ НЕ ДЗЕЛЯ СЛАВЫ. ГРЫНЕВІЧ Мікалай Кірылавіч**

*бібліятэкар I катэгорыі*
*філіяла «Лукская сельская бібліятэка»*
*Н. І. Петруковіч*

**ГЕНЕРАЛ-МАЁР З ВЁСКІ ТЭЎЛІ. ШУГАЙ Дзмітрый Рыгоравіч**

*бібліятэкар II катэгорыі*
*філіяла «Тэвельская сельская бібліятэка»*
*Л. М. Крагель*

**С МИЛЫМ КРАЕМ ДЫШУ ЗАОДНО. КИРИЛЮК Мария Андреевна**

*бібліятэкар*
*філіяла «Акцябрская сельская бібліятэка»*
*Т. А. Шаўцова*

Тэмай біябібліяграфічнага асветніцкага праекта «**Працаваў не дзеля славы»** Ніны Петруковіч, бібліятэкара *філіяла* «*Лукская сельская бібліятэка*», стаў жыццёвы шлях арганізатара і першага кіраўніка гаспадаркі - саўгаса «Дружба» Кобрынскага раёна – **МІКАЛАЯ КІРЫЛАВІЧА ГРЫНЕВІЧА.**




У праекце раскрыта асоба М. К. Грыневіча як ветэрана Вялікай Айчыннай вайны і актыўнага ўдзельніка грамадскага жыцця Кобрыншчыны.

Даведацца пра гэтага выдатнага чалавека дапамагла ў тым ліку аўтабіяграфічная кніга ўспамінаў «Воспоминания в живом исполнении», якой сваякі Мікалая Кірылавіча падзяліліся з супрацоўнікам бібліятэкі.

У рамках праекта выдадзены буклет ***«Першы кіраўнік саўгаса “Дружба”».***



Одновременно с другими деревнями Кобринщины в 1943 г. была полностью уничтожена гитлеровскими карателями дер. Лука сожжено 75 дворов и расстреляно 30 человек. Это не должно повториться!

Як былы франтавік і ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Мікалай Грыневіч вялікую ўвагу надаваў захаванню памяці аб загінуўшых земляках. Дзякуючы яго намаганням на будынку сельскага клуба была ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў памяць аб спаленай вёсцы Лука і расстраляных земляках.

Сам Мікалай Кірылавіч Грыневіч, як ветэран Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За перамогу над Германіяй» і інш.

**ГРЫНЕВІЧ**
**Мікалай Кірылавіч**
**(1926-2018)**

*Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.* Ваяваў на 2-м Беларускім фронце ў складзе 65-й арміі 413-й стралковай дывізіі 1320-га стралковага палка-аўтаматчык. Вызваляў Польшчу. У лютым 1945 г. быў цяжка паранены.

*Аграном-арганізатар.* Працаваў бухгалтарам калгаса «Бальшавік» (1949-1954), загадчыкам свінагадоўчай фермай (1954-1957). Наменсік старшыні калгаса «Бальшавік» Кобрынскага раёна (1960-1962), галоўны аграном калгаса імя Дзяржынскага Кобрынскага раёна (1962-1969).

Дырэктар племсаўгаса «Дружба» (1969-1979). Саўгас у 1972, 1973, 1975 гг. быў пераможцам па вытворчасці кармоў у Рэспубліканскім сацспаборніцтве.

Дырэктар Кобрынскага хлебапрыёмнага прадпрыемства (1979-1988).

*Актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця Кобрыншчыны.*
У 1988 г. выйшаў на пенсію. Інструктар (1990-1994), старшыня Кобрынскага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў» (з 1994).
У паслужным спісе М. К. Грыневіча ордэн «Знак Пашаны» (1967).

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Лукская публічная бібліятэка

**ПЕРШЫ КІРАЎНІК САЎГАСА «ДРУЖБА»**

22 красавіка 1969 г. у в. Лука Кобрынскага раёна быў створаны саўгас «Дружба» на базе асушаных зямель масіва «Польскае балота».

Общество с ограниченной ответственностью «Дружба-Агропроизводство»

На пасаду дырэктара быў прызначаны Мікалай Кірылавіч Грыневіч. Наступныя 10 гадоў былі аддадзены кіраўніцтву племсаўгасам «Дружба». Менавіта ў тыя гады была закладзена аснова сённяшняму дабрабыту саўгаса.

За тры гады існавання саўгаса змаглі пабудаваць шмат дамоў, з'явіліся новыя вуліцы: вул. Міра, вул. Касманаўтаў, вул. Камсамольская.

вуліца Міра

вуліца Касманаўтаў

Новы будынак Лукскай СШ. 1975 год

У 1976-1977 гг. былі пабудаваны сярэдняя школа, дзіцячы садок, клуб, бібліятэка, адміністрацыйны будынак і гандлёвы цэнтр у в. Лука.

Рашэннем Кобрынскага райвыканкама было намечана пабудаваць васьмігадовую школу ў в. Лука. Планавалася, што школу будуць наведваць дзеці з вёсак: Лука, Зосіна, Старая Тэмра і Навасёлкі. Новая школа прыняла дзяцей школьнага ўзросту ў 1975 г.

«**Генерал-маёр з вёскі Тэўлі**» – такую назву носіць праект *філіяла* «*Тэвельская сельская бібліятэка*» (бібліятэкар Любоў Крагель) пра **ДЗМІТРЫЯ РЫГОРАВІЧА ШУГАЯ.**




З дзяцінства юнак марыў стаць ваенным і пасля атрымання сярэдняй адукацыі паступіў у Вышэйшае ваеннае каманднае вучылішча ўрадавай сувязі Калінінградскай вобласці, потым закончыў ваенную акадэмію імя С. М. Будзённага ў г. Ленінградзе.

Служыў на Курыльскіх астравах, нёс службу ў г. Находка Прыморскага краю, у г. Хабараўску.

Пасля распаду Савецкага Саюза Дзмітрый Шугай напісаў рапарт і пераехаў у родную Беларусь. Служыў намеснікам старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь па рэжыму і арганізацыйным забеспячэнні.

Асноўнымі крыніцамі даследавання бібліятэкара з’явіліся інтэрв’ю з героем праекта Дзмітрыем Рыгоравічам, які сёння пражывае ў Мінску, успаміны родных, а таксама фотаздымкі з сямейнага архіва.




Біяграфію жыцця і творчасці паэткі, майстрыхі і рукадзельніцы **МАРЫІ АНДРЭЕЎНЫ КІРЫЛЮК** на краязнаўчых чытаннях прадставіла бібліятэкар *філіяла* «*Акцябрская сельская бібліятэка*» Тацццяна Шаўцова ў праекце «**С милым краем дышу заодно**».

Пра гераіню праекта можна смела сцвярджаць: дзе нарадзілася, там і згадзілася! Здаецца, што не было такой сферы, дзе б яна ні прымала дзейсны ўдзел. 25 гадоў Марыя Андрэеўна працавала дырэктарам школы, была старастай вёскі, актыўна ўдзельнічала ў культурным жыцці вёскі.

Вядомая на ўсю рэспубліку майстрыха-каравайніца, таленавітая паэтэса і проста цудоўны чалавек. Яе энтузіязм і сапраўдная любоў да сваёй малой радзімы невычарпальныя. Істотна дапоўніў даследаванне камплект паштовак з караваямі «**Тварэнне рук, душы і сэрца Марыі Кірылюк**» і зборнік вершаў «**Ностальгия**», падрыхтаваныя супрацоўнікам бібліятэкі.




*Зборнік вершаў Марыі Кірылюк «Ностальгия»*




*Камплект паштовак з караваямі*
*«Тварэнне рук, душы і сэрца Марыі Кірылюк»*

# II этап

**УЧИТЕЛЬ, ДАРЯЩИЙ СВЕТ. ФИЛЮТОВИЧ Вера Львовна**

*библиотекарь II категории*
*филиала «Магдалинская сельская библиотека»*
*Л. А. Жарин*

**ЖИЗНЬ, ОТДАННАЯ ЖИВОТНОВОДСТВУ. ГИЛЁВА Надежда Дмитриевна**

*библиотекарь*
*филиала «Именинская сельская библиотека»*
*Ж. Л. Трубчик*

**ПРОСВЕТИТЕЛЬ И ГУМАНИСТ. ВЕРХОВЕЦ Владимир Лукич**

*библиотекарь*
*филиала «Батчинская сельская библиотека»*
*И. Г. Климук*






Проект **«Учитель, дарящий свет»** *філіяла «Магдалінская сельская бібліятэка»* (бібліятэкар Ларыса Жарын) - даніна павагі заслужанаму настаўніку БССР **ВЕРЫ ЛЬВОЎНЕ ФІЛЮТОВІЧ**.

Яна працавала ў школах Кобрынскага раёна. Каля 16 гадоў настаўнічала ў Барысаўскай пачатковай школе, унесла вялікі ўклад у справу адукацыі і выхавання падрастаючага пакалення. І не дзіўна, што многія яе вучні, выпускнікі Барысаўскай школы, сталі вядомымі людзьмі і з удзячнасцю пранеслі ўспаміны аб сваім першым настаўніку праз усё жыццё.

Аўтар праекта Ларыса Жарын прадставіла дакументы, успаміны пра гераіню, фотаматэрыялы, паразмаўляла з супрацоўнікамі Барысаўскай школы і ў сваёй працы адзначыла вялікую ролю настаўніка ў жыцці вучняў.




Работа *філіяла «Імянінская сельская бібліятэка* «**Жизнь, отданная животноводству**» (бібліятэкар Жанна Трубчык) прысвечана **НАДЗЕІ ДЗМІТРЫЕЎНЕ ГІЛЁВАЙ**, даярцы-ударніцы саўгаса імя Жданава (цяпер – ААТ «Агра-Кобрынскае»), кавалеру ордэна «Знак пашаны», узнагароджанай Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Клапатлівая маці, добрая гаспадыня, перадавая даярка – усё гэта пра Надзею Гілёву.

Пабудаваны праект на шматлікіх успамінах: сына, іншых сваякоў, калег па працы, сяброўак, суседзяў. Сын Сяргей беражліва захоўвае ўсе ўзнагароды, дакументы, якія тычацца працоўнай дзейнасці маці.

Праект адкрывае нам чалавека-працаўніка - адказнага, добрасумленнага, неабыякавага да сваёй справы, па-добраму настроенага да людзей.




Ірына Клімук, бібліятэкар *філіяла «Батчынская сельская бібліятэка»*, прадставіла краязнаўчы біябібліяграфічны праект **«Асветнік і гуманіст»** - пра дзяржаўнага дзеяча, выдатніка народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь **УЛАДЗІМІРА ЛУКІЧА ВЕРХАЎЦА**, ураджэнца вёскі Літвінкі. Як выявілася, сама бібліятэкар з’яўляецца яго далёкай сваячкай.

Просты і даступны, Уладзімір Лукіч быў узорам кіраўніка новай фармацыі. Працавітасць, тонкі гумар, смеласць і рашучасць у адстойванні сваіх прынцыпаў і поглядаў - гэтыя якасці адзначалі і шанавалі ўсе, хто з ім працаваў. Дарэчы, у чэрвені 1970 года Уладзімір Верхавец быў выбраны першым сакратаром Кобрынскага райкама КПСС, і пад яго кіраўніцтвам Кобрынскі раён выйшаў на шлях устойлівага развіцця.

У. Л. Верхавец - чалавек машэраўскага кола, старшыня Дзяржаўнага камітэта БССР па прафесійна-тэхнічнай адукацыі, за перыяд кіраўніцтва якога быў значна ўмацаваны прэстыж прафтэхадукацыі. Ужо першыя рэфарматарскія ідэі Уладзіміра Лукіча спадабаліся першаму сакратару ЦК Кампартыі БССР Пятру Машэраву, які лічыў падрыхтоўку рабочых кадраў і павышэнне іх кваліфікацыі жыццёва неабходным. У выніку ў 1980-я гады якасць прафтэхадукацыі Беларусі была адзначана на саюзным узроўні.

Уладзімір Лукіч Верхавец двойчы выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак пашаны», шасцю медалямі.

# III этап

**ЖЫЦЦЁ – САМЫ СУР’ЁЗНЫ ПРАДМЕТ. БОГДАН Алена Леанідаўна**

*загадчык*
*філіяла «Дзівінская сельская бібліятэка»*
*Л. А. Свідуновіч*

**ПРОГРАММИСТ, НОВАТОР, РАЦИОНАЛИЗАТОР. ЛЕВОНЮК Евгений Евгеньевич**

*бібліятэкар II катэгорыі*
*філіяла «Стрыгаўская сельская бібліятэка»*
*Т. А. Качан*

**ХРАНИТЕЛЬНИЦА НАСЛЕДИЯ. ГЛОВАЦКАЯ Нина Никитична**

*бібліятэкар II катэгорыі*
*філіяла «Арэхаўская сельская бібліятэка»*
*Т. А. Калтунчык*






Праект *філіяла «Дзівінская сельская бібліятэка»* «**Жыццё – самы сур’ёзны прадмет**» прысвечаны **АЛЕНЕ ЛЕАНІДАЎНЕ БОГДАН**, беларускаму ўрачу і дзяржаўнаму дзеячу.

Першы намеснік Міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь (2020-2021), старшыня грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын» (з 2020), намеснік Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы (з 2023).

Дарэчы, у самы трывожны час, калі свет змагаўся з каранавіруснай інфекцыяй, Алену Леанідаўну прызначылі намеснікам міністра аховы здароўя, а потым і першым намеснікам. За шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у развіццё сістэмы аховы здароўя насельніцтва, выдатныя творчыя дасягненні Алена Богдан адзначана медалём «За працоўныя заслугі» (2017).

Алена Леанідаўна не страчвае сувязі з Дзівінам, адкуль родам, заўсёды сочыць за навінамі жыцця роднага мястэчка, з радасцю вяртаецца сюды.

Гераіню праекта на краязнаўчых чытаннях прадставіла Людміла Свідуновіч, загадчык філіяла «Дзівінская сельская бібліятэка». Яна падрабязна расказала аб сваёй зямлячцы, яе дзіцячых і юнацкіх гадах. Адзначыла, што ўдзячна бацькам гераіні праекта Леаніду Аляксандравічу і Вользе Пятроўне за дапамогу ў зборы матэрыялу, а таксама самой Алене Леанідаўне за яе камунікабельнасць, адкрытасць, шчырасць.

У розныя часы людзі маюць патрэбу ў героях, і ў розныя часы яны свае. Герой праекта «**Праграміст, наватар, рацыянізатар**» *філіяла «Стрыгаўская сельская бібліятэка»* (бібліятэкар Тамара Качан) - ураджэнец вёскі Мацы **ЯЎГЕНІЙ ЯЎГЕНЬЕВІЧ ЛЕВАНЮК.**




Дарэчы, вёска гэта - кладзезь талентаў. Яна дала свету шмат цікавых, адораных людзей, якія дасягнулі значных вышынь у розных галінах чалавечай дзейнасці.

Яўгеній Леванюк - спецыяліст у галіне праграмнага забеспячэння, працаваў інжынерам, малодшым навуковым супрацоўнікам, галоўным спецыялістам, намеснікам начальніка аддзела, начальнікам аддзела ў розных установах г. Мінска. За час працоўнай дзейнасці, а гэта каля 45 гадоў, Яўгеній Яўгеньевіч унёс шмат канструктыўных, рацыяналізатарскіх прапаноў, з'яўляецца аўтарам і суаўтарам шэрагу артыкулаў у часопісе «Веснік Акадэміі навук».




Цікавы матэрыял прадставіла Тамара Калтунчык, бібліятэкар *філіяла* «*Арэхаўская сельская бібліятэка*».

Яе гераіня **НІНА НІКІЦІЧНА ГЛАВАЦКАЯ** - кіраўнік фермерскай гаспадаркі «Алесін сад», заснавальнік аграэкасядзібы «Палескія традыцыі», актыўны грамадскі дзеяч, захавальніца культурнай спадчыны, дэлегат міжнародных кангрэсаў па пытаннях здаровай ежы, уладальнік тытула «Жанчына года» ў намінацыі «Гаспадыня сяла». І гэта далёка не поўны спіс яе дасягненняў.

Яна адна з першых, хто стаяў ля вытокаў развіцця сельскага агратурызму ў Беларусі. «*Мая самая вялікая праблема – гэта тое, што ў сутках усяго 24 гадзіны. І хоць я сплю толькі шэсць гадзін, астатніх 18 мне мала*», - гаворыць наша гераіня.

Нягледзячы на тое, што жыве і працуе Ніна Главацкая ў вёсцы Андронава і тэрытарыяльна не звязана з пасёлкам Арэхаўскі, невыпадкова менавіта жыхарка Арэхаўскага адзначыла гэту асобу ў сваім праекце. Справа ў тым, што ў свае маладыя гады сям’я Главацкіх пераехала ў пасёлак Арэхаўскі і каля 15 гадоў пражывала там. У 1980-я гады мінулага стагоддзя ў Брэсцкай вобласці будаваліся новыя пасёлкі, ствараліся перспектыўныя сельскагаспадарчыя комплексы. Пасёлак Арэхаўскі - дарагое сэрцу месца для гераіні. Ніна Нікіцічна з настальгіяй успамінае час, пражыты ў пасёлку, бо гэта былі лепшыя маладыя гады. На ўсё хапала сілы: на працу, на сям'ю, на грамадскую дзейнасць. Працавала яна ў гаспадарцы спачатку бухгалтарам, затым эканамістам, а потым старшынёй прафкама саўгаса «Днепра-Бугскі». І ўсюды Ніна Главацкая была ў цэнтры падзей. Як прафсаюзны лідэр прымала актыўны ўдзел у паляпшэнні ўмоў побыту і жыцця аднавяскоўцаў; будучы ініцыятыўнай і энергічнай, арганізоўвала розныя мерапрыемствы для сваіх аднавяскоўцаў, стаяла ля вытокаў і была актыўнай удзельніцай народнага хору «Світанак».



В агроусадьбе проводился семинар-практикум «Этнографический туризм как способ возрождения и сохранения этнокультурного наследства Беларуси». В мероприятии приняли участие более 30 представителей бизнес-индустрии Минска, ряда белорусских ВУЗов, СМИ и интернет-порталов.

На агроусадьбе «Палескія традыцыі» прошёл международный кулинарный конкурс «Палескія прысмакі».

Фестиваль «Креативный возраст», приуроченный ко Дню пожилого человека и Году малой родины, собрал более сотни человек.

Рушники, сундуки и другие предметы крестьянского быта можно увидеть практически в любой агроусадьбе, а вот такую хозяйку, как Нина Никитична, встретишь нечасто. Она стала настоящей достопримечательностью «Полесских традиций». Гостей, которые приезжают на отдых или на экскурсию в усадьбу, Нина Никитична встречает в красивом национальном костюме. А еще сама поет народные песни. И не просто поет, а старается вовлечь «в концерт» гостей, чтобы они не только слушали, а были активно задействованы в музыкальном общении.

В 2018 году Нина Гловацкая стала победительницей конкурса «Женщина года» в номинации «Хозяйка села». Судьбой предназначено этой трудолюбивой женщине, влюбленной в землю своих предков, стать нитью, через которую будет проходить связь поколений, передаваться богатое культурное наследие.

Государственное учреждение культуры
«Кобринская централизованная
библиотечная система»
Ореховская публичная библиотека

ХОЗЯЙКА СЕЛА

Гловацкая
Нина Никитична

Ореховский
2024



Нина Никитична Гловацкая (Жиговец) родилась 2 января 1961 года в деревне Радостово Дрогичинского района Брестской области в крестьянской семье.

Отец рано умер, и ей, как старшей из четверых сестёр, приходилось много работать, помогать маме по хозяйству. Нина Никитична с детства приучена к труду, любви к родной земле и уважению к людям



В 1978 году окончила Радостовскую среднюю школу. После окончания Белорусского государственного института народного хозяйства им. Куйбышева стала экономистом.

ПОСЁЛОК ОРЕХОВСКИЙ

В 80-е годы XX ст. строились новые поселки, создавались перспективные сельскохозяйственные комплексы. К тому времени молодая семья Гловацких решили переехать в поселок Ореховский Кобринского района, куда съезжалась молодежь из окрестных деревень и Украины.

Нина Никитична работала в хозяйстве бухгалтером, затем экономистом, а потом её избрали председателем профкома совхоза “Днепро-Бугский”. Муж тоже не отставал, был одним из лучших механизаторов, избирался депутатом Верховного Совета 11-го созыва. В семье подрастало трое детей - сын и две дочери.

Бывшие коллеги вспоминают, что Нина Гловацкая могла найти подход к каждому, поэтому пользовалась уважением и поддержкой у рабочих совхоза и жителей посёлка. Будучи инициативной и энергичной, она организовывала разные мероприятия для своих односельчан, стояла у истоков и была активной участницей народного хора “Світанак”.

Именно благодаря ей участники хора дарили народные песни жителям белорусских городов, покоряли сердца зрителей Карпат и Черноморского побережья.

В 90-х годах Гловацкие стали заниматься коммерцией, ездили в Польшу, покупали яблоки и продавали их в Беларуси и России. Нину Никитичну поразили сады Польши и она загорелась желанием посадить свой сад. Их семье пришлось оставить дорогие сердцу места, проститься с людьми и переехать поближе к Кобрину.

Все эти годы Нина Никитична снабжает продукцией своего фермерского хозяйства жителей посёлка, материально поддерживает храм Серафима Саровского.

АГРОУСАДЬБА «ПОЛЕССКИЕ ТРАДИЦИИ»



Деревня Андроново возле Кобрина стала новым местом жительства семьи Гловацких.

Предлагаемые условия проживания, питание и развлечения отражают традиционную культуру быта белорусов Западного Полесья, которая передавалась из поколения в поколение и сохранилась до наших дней благодаря таким подвижникам, как Нина Гловацкая.

В фермерском хозяйстве агроусадьбы выращиваются овощи и яблоки, для хранения которых оборудован огромный склад. А летом он превращается в красивое помещение для проведения мероприятий «Яблочный SA-рай».

Хозяйка агроусадьбы «Полесские традиции» Нина Гловацкая из своего опыта знает, что народные белорусские традиции - это именно то, что можно предложить посетителям для культурного отдыха.

***Буклет «Хозяйка села», прысвечаны Ніне Главацкай – кіраўніку фермерскай гаспадаркі «Алесін сад», заснавальніку аграэкасядзібы «Палескія традыцыі»***

# IV этап

**ВЕЛІЧ ЧАЛАВЕКА Ў ПРАЦЫ. РАМАНЮК Алена Фамінічна**

бібліятэкар І катэгорыі філіяла «Залеская сельская бібліятэка»
І. В. Пакалюк

**СЛАЎНЫ ПРАЦАЙ ЧАЛАВЕК. ПАРХУЦІК Іван Якаўлевіч**

бібліятэкар ІІ катэгорыі філіяла «Хідрынская сельская бібліятэка»
А. І. Мех

**УСЯМУ ПАЧАТАК ТУТ, У КРАІ МАІМ РОДНЫМ. ШВАЙКО Валянціна Фёдараўна**

бібліятэкар І катэгорыі філіяла «Астроміцкая сельская бібліятэка»
К. А. Рэдзьковіч

**СОХРАНЯЯ ПАМЯТЬ О ВОЙНЕ. КИРИЕВСКИЙ Павел Иванович**

бібліятэкар ІІ катэгорыі філіяла «Кіселявецкая сельская бібліятэка»
Н. І. Кірчук

**ПРИЗВАНИЕ ВСЕЙ ЖИЗНИ. ЗАПАШНИК Евгений Казимирович**

бібліятэкар філіяла «Гарадзецкая сельская бібліятэка»
Т. Л. Барысевіч





Гераіня праекта *філіяла «Залеская сельская бібліятэка»* (бібліятэкар Ірына Пакалюк) **АЛЕНА ФАМІНІЧНА РАМАНЮК** не здзейсніла гераічнага ўчынку, не зрабіла адкрыццяў. Яна толькі старанна і сумленна працавала на даручаным участку - у жывёлагадоўлі, на ферме ў вёсцы Залессе, і з кожным месяцам дасягала высокіх надояў малака ад кожнай каровы.

Ужо праз чатыры гады работы на ферме саўгаса імя Суворава Кобрынскага раёна жанчына была адзначана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1977), а ў 1984 годзе ёй разам з іншымі знакамітымі людзьмі Брэстчыны быў уручаны ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі. У дадатак да вышэй адзначаных узнагарод і звання «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР», якога Алена Раманюк была ўдастоена ў 1986 годзе, былі чатыры медалі ВДНГ, сем значкоў пераможца сацыялістычнага спаборніцтва, значкі ўдарніка камуністычнай працы і дзесятай пяцігодкі.

Працаваць у сферы сельскай гаспадаркі могуць толькі неабыякавыя да агульнай справы людзі, якія хварэюць душой за сваё роднае сельгаспрадпрыемства. Такія, як Алена Фамінічна, якая з'яўляецца безумоўным прыкладам працавітасці, старання і ўмення. Яна пайшла з жыцця ў 2023 годзе, але засталася светлая памяць аб ёй як добрым, адказным, працавітым чалавеку.



Бібліятэкар *філіяла «Хідрынская сельская бібліятэка»* Алена Мех у праекце «**Слаўны працай чалавек**» пазнаёміла са сваім таленавітым аднавяскоўцам **ІВАНАМ ЯКАЎЛЕВІЧАМ ПАРХУЦІКАМ**, народным умельцам, майстрам разьбы па дрэве, мэбляром, мастаком.

«*У Якаўлевіча і рукі залатыя, і душа добрая. І гаспадар ён выдатны*», - так гавораць пра Івана Пархуціка жыхары аграгарадка Хідры. Іван Якаўлевіч умее бачыць прыгажосць ва ўсім, нават у тым, што для некаторых з’яўляецца старой непатрэбнай рэччу.

Дарэчы, ужо на першым курсе вучобы ў Бабруйскім мастацкім вучылішчы юнак маляваў на заказ партрэты, а дыпломная работа пад назвай «Белавежская пушча» студэнта Івана Пархуціка была прадстаўлена на выстаўцы ў вучылішчы, далей у Маскве на ВДНГ, а пазней - у Фінляндыі.

Двадцаць гадоў, з 2001 года па 2021 год, Іван Якаўлевіч праводзіў заняткі для дзяцей па разьбе па дрэве пры Хідрынскім Доме культуры. Безумоўна, большасць дзяцей, якія прыходзілі на гэтыя заняткі, не сталі прафесійнымі сталярамі і разьбярамі. Але займаючыся рамяством, яны змаглі дакрануцца да прыгажосці, ствараць яе сваімі рукамі, адчуваць сябе творцам.

Сёння Іван Пархуцік – прадпрымальнік. Шматлікія сувеніры, многія з якіх зроблены на беларускі матыў, майстар выточвае і выразае з цеплынёй і любоўю. І невыпадкова яны маюць свой непаўторны выгляд, а некаторыя - нават характар. Як удзельнік раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных выстаў наш герой мае вялікую колькасць грамат і дыпломаў рознага ўзроўню. Іван Якаўлевіч - цікавы суразмоўца, з захапленнем расказвае пра тонкасці тэхналогій і тыпы драўніны, паказвае свае творчыя цікавыя работы.

Буклет **«Майстэрства рук, душы парывы»**, падрыхтаваны ў рамках праекта, яркае пацвярджэнне таму.








Краязнаўчы біябібліяграфічны асветніцкі праект **«Усяму пачатак тут, у краі маім родным»**, які прадставіла бібліятэкар *філіяла «Астроміцкая сельская бібліятэка»* Кацярына Рэдзьковіч, прысвечаны **ВАЛЯНЦІНЕ ФЁДАРАЎНЕ ШВАЙКО** - вучонаму, кандыдату філасофскіх навук.

Нарадзілася Валянціна ў вёсцы Астромічы ў сям'і настаўніцы і ўчастковага інспектара міліцыі. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а потым аспірантуры працавала загадчыкам кафедры методыкі выхавання ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, які з’яўляецца навукова-метадычнай установай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Прымала ўдзел у падрыхтоўцы метадычных матэрыялаў па пытаннях вучнёўскага самакіравання ў прафтэхвучылішчы г. Мінска, была адным са складальнікаў метадычнага дапаможніка «Молодёжный центр: основные направления социальной работы».

Жыццёвым прыкладам для Валянціны Фёдараўны заўсёды быў яе бацька **Фёдар Фёдаравіч Швайко**, імя якога ёсць на старонках гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Кобрынскі раён» у раздзеле «Змагаліся ў тыле ворага». Фёдар Швайко - удзельнік вызвалення Кобрыншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1952-га да 1970 года ён узначальваў крымінальны вышук на Кобрыншчыне, быў узнагароджаны медалямі «За трудовое отличие» і «За безупречную службу». Такім чынам, узгадалі і яшчэ пра аднаго вядомага земляка.



З лёсам ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, добрасумленнага сельскага працаўніка, жыхара вёскі Рыбна **ПАЎЛА ІВАНАВІЧА КІРЫЕЎСКАГА** пазнаёміла бібліятэкар *філіяла «Кіселявецкая сельская бібліятэка»* Наталля Кірчук.

У першыя гады вайны, калі вёска была захоплена фашыстамі, Павел трымаў сувязь з партызанскім атрадам, збіраў і перадаваў

інфармацыю партызанам. На фронт пайшоў у 1944 годзе, быў камандзірам разліку гарматы (гаўбіца).

Павел Кірыеўскі любіў жыццё, людзей і музыку. Падчас адпачынку паміж баямі ён часта браў у рукі свой гармонік, музыкай і песняй падтрымліваў баявы дух салдат у кровапралітныя гады.

Сярод звестак, знойдзеных у выніку пошукава-даследчай дзейнасці, прадстаўлены загады аб узнагароджанні і суправаджальныя дакументы да іх, радкі ў узнагародным спісе, інфармацыя з галерэі «Дарога памяці», з партала «Памяць народаў» і інш. Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы праекта аказвалі дачка і ўнучка героя. Сям'я беражліва захоўвае памяць пра свайго бацьку і дзеда – удзельніка Вялікай Айчыннай вайны. У год 80-годдзя вызвалення Беларусі асабліва важна ўспамінаць герояў вайны і адчуваць неабходнасць захавання міру. У нашых сілах зрабіць так, каб герояў памяталі і шанавалі будучыя пакаленні, і тады ніколі не знікне Памяць.



Выступленне бібліятэкара *філіяла «Гарадзецкая сельская бібліятэка»* Тамары Барысевіч было прысвечана ўраджэнцу вёскі Гарадзец, заслужанаму ўрачу Рэспублікі Беларусь, урачу-стаматолагу **ЯЎГЕНІЮ КАЗІМІРАВІЧУ ЗАПАШНІКУ.**

Яго імя ёсць у энцыклапедыі «Кто есть Кто в Республике Беларусь», якая змяшчае інфармацыю аб людзях, якія дабіліся прафесійных і дзелавых поспехаў, унеслі свой уклад у развіццё розных сфер дзейнасці.

Працаваў Яўгеній Казіміравіч галоўным урачом гарадской стаматалагічнай паліклінікі № 2 г. Брэста, шмат гадоў узначальваў лячэбна-прафілактычную ўстанову «Брэсцкая абласная стаматалагічная паліклініка № 1». За гады яго працы быў створаны калектыў прафесіяналаў, сапраўдных майстроў сваёй справы. Яўгеній Запашнік зрабіў немалы ўклад у развіццё стаматалогіі Брэстчыны. Вялікі практычны вопыт Яўгенія Казіміравіча, яго веды, майстэрства, метады работы запатрабаваны і сёння.

Наш герой узнагароджаны значком «Выдатнік аховы здароўя», а ў 2004 годзе яму прысвоена званне «Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь».

# ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ «Імя ў летапісе малой радзімы»

## *I месца* – філіял «Лукская сельская бібліятэка»

бібліятэкар I катэгорыі<br>філіяла «Лукская сельская бібліятэка»<br>Н. І. Петруковіч

## *II месца* – філіял «Акцябрская сельская бібліятэка»

бібліятэкар<br>філіяла «Акцябрская сельская бібліятэка»<br>Т. А. Шаўцова

## *III месца* - філіял «Тэвельская сельская бібліятэка»; філіял «Імянінская сельская бібліятэка»

бібліятэкар II катэгорыі філіяла «Тэвельская сельская бібліятэка»<br>Л. М. Крагель;<br>бібліятэкар філіяла «Імянінская сельская бібліятэка»<br>Ж. Л. Трубчык














# ЗМЕСТ

**Прадмова** 3

**Палажэнне** аб раённым конкурсе «Імя ў летапісе малой радзімы» 4

**Жыццё са знакам якасці**: краязнаўчыя чытанні ў рамках раённага конкурсу«Імя ў летапісе малой радзімы» 8

*I этап*........................................................................................12

**Працаваў не дзеля славы. Грыневіч Мікалай Кірылавіч**
(філіял «Лукская сельская бібліятэка»)
**Генерал-маёр з вёскі Тэўлі. Шугай Дзмітрый Рыгоравіч**
(філіял «Тэвельская сельская бібліятэка»)
**С милым краем дышу заодно. Кирилюк Мария Андреевна**
(філіял «Акцябрская сельская бібліятэка»)

*II этап*........................................................................................16

**Учитель, дарящий свет. Филютович Вера Львовна**
(филиал «Магдалинская сельская библиотека»)
**Жизнь, отданная животноводству. Гилёва Надежда Дмитриевна**
(филиал «Именинская сельская библиотека»)
**Просветитель и гуманист. Верховец Владимир Лукич**
(филиал «Батчинская сельская библиотека»)

*III этап*........................................................................................19

**Жыццё – самы сур'ёзны прадмет. Богдан Алена Леанідаўна**
(філіял «Дзівінская сельская бібліятэка»
**Программист, новатор, рационализатор. Левонюк Евгений Евгеньевич (**філіял «Стрыгаўская сельская бібліятэка»)
**Хранительница наследия. Гловацкая Нина Никитична**
(філіял «Арэхаўская сельская бібліятэка»)

*IV этап*........................................................................................ 23

**Веліч чалавека ў працы. Раманюк. Алена Фамінічна**
(філіял «Залеская сельская бібліятэка»)
**Слаўны працай чалавек. Пархуцік Іван Якаўлевіч**
(філіял «Хідрынская сельская бібліятэка»)
**Усяму пачатак тут, у краі маім родным. Швайко Валянціна Фёдараўна** (філіял «Астроміцкая сельская бібліятэка»)
**Сохраняя память о войне. Кириевский Павел Иванович**
(філіял «Кіселявецкая сельская бібліятэка»)
**Призвание всей жизни. Запашник Евгений Казимирович**
(філіял «Гарадзецкая сельская бібліятэка»)

**Падвядзенне вынікаў конкурсу** 28

# Жыццё са знакам якасці

***Інфармацыйна-аналітычны зборнік даследчых краязнаўчых праектаў у рамках конкурсу «Імя ў летапісе малой радзімы»***

**Інфармацыйна-даведачнае выданне**

На беларускай, рускай мовах

Складальнік
Святлана Курачук

Камп'ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

Надрукавана на камп'ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай раённай цэнтралізаванай
бібліятэчнай сістэмы

225306 вул. Маршала Жукава, 12, г. Кобрын
Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
E-mail: kobrinlib@gmail.com